Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

30 ВЕРАСНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 185 (27795) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Калі ўключаць ацяпленне?

СТАР. 3



Паспейце ў госці да Быкава

СТАР. 6

ЦЫТАТА ДНЯ

Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў:

«Кошт пуцёвак у беларускія здраўніцы на міжсезонне не павысіцца. Дарэчы, фізічныя і юрыдычныя асобы сёлета ў студзені—жніўні набылі ў свабоднай рэалізацыі 417,5 тысячы пуцёвак (без прыцягнення сродкаў рэспубліканскага бюджэту і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання). Пры тым, што колькасць пуцёвак у свабоднай рэалізацыі павялічылася амаль на 3 тыс. у параўнанні са студзенем—жніўнем мінулага года, выручка ад рэалізацыі паслуг узрасла на 20% і дасягнула Br1 трлн 848 млрд. Запаўняльнасць санаторыяў у летні перыяд была высокая — амаль 100% (у студзені—жніўні — у сярэднім 87%). Нашы здраўніцы працуюць стабільна і дынамічна развіваюцца».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 30.09.2014 г.

Долар ЗША	10580,00	▲
Еўра	13420,00	▼
Рас. руб.	269,00	▼
Укр. грыўня	816,99	▼

ISSN 1990 - 763X

14185

9 771990 763008

СВІСЛАЧ УЗДЫХНУЛА ЛЯГЧЭЙ

У суботу на галоўнай воднай артэрыі сталіцы — Свіслачы, прайшла валанцёрская экалагічная акцыя па прыбіранні берагоў ракі ад бытавога смецця. Два дзясяткі неабыякавых людзей прайшліся «генеральнай прыборкай» уздоўж берага ў раёне мінскіх вуліц Сямёнава і Маякоўскага, дзе рака цячэ побач з жылымі дамамі. Менавіта тут на Свіслачы застаўся некрануты куток дзікай прыроды — вільготныя пойменныя лугі, алешнікі і лазнякі.

Валанцёры з грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» з супрацоўнікамі мінскага піўзавода «Аліварыя» з падтрымкай Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўжо некалькі гадоў запар удзельнічаюць у праектах, накіраваных на абарону Свіслачы. Сёлета ў рамках кампаніі «Чыстая плынь» працягвалася праца па навядзенні парадку ў пойме ракі: устаноўлены скрыні для паасобнага збору смецця, лаўкі для адпачынку, адрамантаваны мост праз раку. Маладыя ўдзельнікі акцыі расказваюць: у гэтым кутку Мінска жыве шмат птушак, з іх нават пяць відаў унесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

■ Жыллё

КЛАСНАЯ КВАТЭРА

Што трэба ведаць, каб пры будаўніцтве дарагога «Прэстыжу» не трапіць у панэльны «Стандарт»

Мяне заўсёды цікавіла пытанне аб тым, як вызначаецца прагнозны кошт яшчэ не пабудаванага жылля ў шматпавярховым доме. Чаму «квадрат» у панэльным доме ацэньваецца танней, чым у больш высокім каркасным? Разам з тым, і панэльныя дамы бываюць розныя, а варыянтаў каркасных дамоў і будынкаў з маналіту і таго больш. Як тут не разгубіцца сярэднестатычнаму спажыўцу пры выбары тыпажу будучых метраў?

НОВАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ ЖЫЛЛЯ

Да апошняга часу ў нас на першасным рынку жылля ўвогуле адсутнічаў своеасаблівы «зборнік» асноўных патрабаванняў да новабудоўляў рознага цэнавага ўзроўню і рознага класа якасці. Камерцыйнае жыллё рознай якасці ў краіне ёсць, а дакладнай і зразумелай градацыі не было. Менавіта таму спецыялістамі групы кампаній «Твая сталіца» сумесна з экспертамі Нацыянальнага кадастравага агенцтва была распрацавана класіфікацыя новабудоўляў Мінска.

Мы таксама вырашылі пацікавіцца, што гэта за «звер» такі і як ён дапаможа пакупніку зразумець, чаго варта чакаць, а чаго і не дачакаешся ад прапанаванага жылля ў кожным канкрэтным сегменце рынку.

У аснову новай класіфікацыі былі запісаны тыя патрабаванні і чаканні, якія сёння прад'яўляюць пакупнікі. У адпаведнасці з імі і былі вызначаны галоўныя параметры, што вызначаюць прыналежнасць аб'екта да жылля больш ці менш высокага ўзроўню. Акрамя мінімальных патрабаванняў да аб'екта канкрэтнага класа, былі знойдзены дадатковыя параметры, наяўнасць якіх усё часцей запытваецца спажыўцамі, але якія яшчэ не паспелі стаць нормай. Менавіта яны павінны задаць вектар развіцця рынку, набліжаючы яго да сусветных стандартаў.

СТАР. 4

■ З перамогай!

«НАСТАЎНІК — ПАЛКАВОДЗЕЦ, ЯКІ ВЯДЗЕ ЎСІХ НАПЕРАД»

Такое крэда ў маладога педагога Віктара Жука, які стаў фаварытам адначасова і дарослага, і дзіцячага журы

Прыдумайце першыя прывітальныя словы толькі што прызначанага класнага кіраўніка, здольныя прыцягнуць увагу школьнікаў... Якая формула поспеху сучаснага педагога?.. Што трэба зрабіць, каб дзеці чыталі кнігі?.. Ад чаго залежыць якасць падрыхтоўкі будучага настаўніка?.. Пытанні літаральна сыпаліся на галовы суперфіналістаў рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года-2014», якія стаялі на сцэне Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

Першае выпрабаванне суперфіналу ўяўляла сабой «прэс-канферэнцыю» з пытанняў і адказаў: на роздум удзельнікам давалася 30 секундаў, але ніхто адведзеным лімітам часу не карыстаўся. І гэта правільна, бо ў рэчаіснасці 30 секундаў для настаўніка — сапраўдная раскоша. Яго рэакцыя павінна быць імгненнай...

Але аб усім па парадку. Нагадаем, што суперфіналу конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў папярэднічаў фінал, у якім узялі ўдзел 49 лепшых педагогаў з усёй краіны — пераможцы абласных і мінскага гарадскога этапаў рэспубліканскага конкурсу ў сямі намінацыях. А ў суперфінал выйшлі толькі 7 лепшых, якія перамаглі ў фінальнай частцы спаборніцтваў: кожны — у сваёй намінацыі. Такім чынам у суперфінале сустрэліся настаўнік гісторыі з сярэдняй школы № 11 г. Маладзечна **Віктар Жук**, настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 3 г. Глыбокае **Святлана Мацулевіч**, настаўніца нямецкай мовы сярэдняй школы № 73 г. Мінска **Наталля Грушко**, выхавальніца ясляў-сада №19 «Пралеска» г. Жодзіна Таццяна Залеўская, настаўнік інфарматыкі базавай школы № 10 г. Наваполацка **Уладзімір Цымановіч**, настаўніца рускай мовы і літаратуры Сноўскай сярэдняй школы Нясвіжскага раёна **Іна Віннік** і настаўніца выяўленчага мастацтва сярэдняй школы № 1 г. Наваполацка **Ірына Хаданёнак**.

СТАР. 2

ЯКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ УЛАДА?

Сумленнай і адкрытай для ўсіх грамадзян, лічыць Прэзідэнт

У чацвер распачне работу асенняя сесія беларускага парламента. На разгляд дэпутатаў і сенатараў будзе прадстаўлена нямала важных законапраектаў. Падчас сустрэчы з членамі Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на асноўных пытаннях маючай адбыцца пятай сесіі.

Прэзідэнт звярнуў увагу дэпутатаў

... на фарміраванне дагаворна-прававой базы ЕАЭС

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што з 2015 года беларуская эканоміка будзе дзейнічаць ва ўмовах Еўразійскага эканамічнага саюза. «Нам з вамі, можа, нават у бліжэйшы час, гэтымі днямі, трэба будзе працаваць над ратыфікацыяй адпаведных міжнародных пагадненняў. І ваша задача — з прымяненнем усіх парламенцкіх інструментаў садзейнічаць фарміраванню дагаворна-прававой базы саюза, пры гэтым трэба стаяць на варце нашых інтарэсаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

... на фарміраванне бюджэту на 2015 год

Бюджэт на 2015 год не павінен быць марнатраўным, заявіў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прыярытэтным напрамкам заканадаўчай дзейнасці павінна стаць вырашэнне пытанняў мадэрнізацыі эканомікі. «Многія гавораць, што не трэба мадэрнізавацца, грошай няма і інш. Але тое, што нельга адкласці на заўтра, — гэта якраз пытанні мадэрнізацыі і ўдасканалення нашых прадпрыемстваў. Калі мы сёння стары станок не заменім на новы, які вырабляе канкурэнтаздольную прадукцыю, — не будзе чаго гаварыць аб дыверсіфікацыі рынкаў, канкурэнтаздольнасці на міжнародных рынках, мы проста прадукцыю гэту не прададзім», — адзначыў Прэзідэнт.

... на даступнасць нарматыўных актаў

Кожны нарматыўны акт павінен быць зразумелым і даступным не толькі юрысту, але і звычайнаму чалавеку, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Ваш практычны вопыт работнікаў вытворчасці, аграрыяў, інжынераў, урачоў, настаўнікаў, спартсменаў, прадстаўнікоў многіх іншых прафесій, а таксама цесная сувязь з выбаршчыкамі павінны стаць фундаментам падрыхтоўкі законапраектаў, якія адпавядаюць патрэбам нашага грамадства», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да дэпутатаў.

Паводле слоў Прэзідэнта, дэпутаты не павінны знаходзіцца ўбаку ад работы па дэбюракратызацыі. «Калі вы бачыце праблему простага грамадзяніна, які не можа прабіцца праз чыноўніцкія перашкоды, дапамажыце яе вырашыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, як чалавек, які прайшоў парламенцкую школу, ведае, што менавіта дэпутат, непасрэдна працуючы з людзьмі, можа адчуць іх настроі, убачыць набалелыя праблемы, недахопы на месцах, задзейнічаць рэзервы. «Улада павінна быць сумленнай, адкрытай і даступнай для ўсіх грамадзян», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дэпутаты павінны знайсці здаровы баланс паміж стабільнасцю заканадаўства і дынамізмам жыцця. Прэзідэнт лічыць, што ўжо на стадыі прапрацоўкі ў пастаянных камісіях дэпутатам неабходна ўяўляць, як закон будзе прымацца і як выконвацца. «Заканадаўчая база ў нас у цэлым сфарміравана. Настаў час прымаць законы, якія не толькі адпавядаюць патрэбам дня, але і вывераны ў плане іх практычнай каштоўнасці, — сказаў Прэзідэнт. — Закон не павінен з дапамогай шматлікіх адсылак перакладваць вырашэнне магчымых праблем яго прымянення на ўрад або выканаўцаў на месцах».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што кожны дэпутат Палаты прадстаўнікоў павінен па магчымасці аказваць дапамогу сваім калегам, дэпутатам мясцовых Саветаў, выступаць з прапановамі, парадамі, падтрымліваць іх.

У размове з дэпутатамі Прэзідэнт таксама гаварыў

... пра вывучэнне беларускай мовы

Паводле слоў Прэзідэнта, цяпер вывучаецца сітуацыя ў сферы сярэдняй адукацыі, дзе таксама хапае праблем. У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў школьную праграму, у якой рускай і нават англійскай мове адводзіцца больш гадзін, чым беларускай.

«Добра, на рускай мове мы практычна ўсе размаўляем. Але на беларускай мове, скажам шчыра, у побыце, дома мы размаўляем менш. Дык, можа, трэба ў школе на карысць беларускай мовы даць адну гадзіну, а не англійскай?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Нараканні ў Прэзідэнта ёсць і да школьнай праграмы па літаратуры, у якую па незразумелых прычынах уключаюцца тыя ці іншыя творы.

... пра дапамогу дзяржавы

Аляксандр Лукашэнка запэўніў у нязменнасці адпаведнага курсу, але падкрэсліў, што грамадзян неабходна ў большай меры арыентаваць і на выкарыстанне ўласных магчымасцяў. «Я, як і вы, вельмі зацікаўлены ў тым, каб падтрымліваць насельніцтва. Але я публічна і часам у жорсткай форме звяртаю ўвагу на тое, што дзяржава не ствараецца для таго, каб карміць каго-небудзь, хто не вельмі хоча на сябе працаваць, — заявіў Прэзідэнт. — Нашы людзі, хто хоча, папросту могуць жыць добра. Трэба паступова беларусаў схіляць да таго, што дзяржава дапаможа, але лепш разлічваць на сябе».

Паводле БЕЛТА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 кастрычніка 2014 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **2 кастрычніка 2014 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 кастрычніка 2014 года з 9.15 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

■ Надвор'е

УНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ

Тэмпературны фон у другой палове тыдня будзе на 2-4 градусы ніжэйшым за кліматычную норму

Сёння ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, а максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс — 12-18 градусаў, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

А ў сераду і чацвер надвор'е ў нашай краіне пачне фарміраваць халодны скандынаўскі антыцыклон. Устаюецца малавоблачнае і сухое надвор'е. Пахаладае. Мінімальная тэмпература паветра ўначы на 1 кастрычніка складзе 1-8 цяпла, аднак месцамі чакаюцца замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Уначы на чацвер замаразкі ад 0 да мінус 4 градусаў будуць ужо паўсюдна на краіне. Удзень будзе толькі плюс 8-15 градусаў. Напрыканцы тыдня будзе пераважна без ападкаў. Раніцай месцамі туман. Уначы замаразкі будуць дасягаць мінус 4 градусаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 7-15 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ

«НАСТАЎНІК — ПАЛКАВОДЗЕЦ...»

Віктар Жук: «Каму належаць словы: «Дайце дзяўчыне пару туфель на шпільках... і яна заваюе ўвесь свет»?»

«РАЗУМЕЮ ЦЯПЕР, ЧАМУ»

«Арыстоцель сцвярджаў, што пазнанне пачынаецца са здзіўлення, а чым вы здзіўляеце сваіх вучняў?» Такое пытанне дасталася настаўніку гісторыі з сярэдняй школы №11 Маладзечна Віктару Жуку. «Рознымі нестандартнымі падыходамі да арганізацыі ўрокаў. Я магу здзівіць сваіх гляду выхаванцу», — парыраваў настаўнік з Маладзечна.

Сапраўдным святам у суперфінале стаў 20-хвілінны ўрок на сцэне на тэму «Разумею цяпер, чаму». Шчыра кажучы, цяжка было ўявіць сабе, як гэту агульную для ўсіх суперфіналістаў тэму можна раскрыць на ўроку інфарматыкі або нямецкай мовы.

«Чаму людзі лянуюцца вывучаць замежныя мовы? Нам літаральна праз гадзіну давя-

Наталля Грушко: «Нямецкая мова вельмі простая. Не трэба баяцца...»

вучняў, прыхапіўшы на ўрок гістарычныя артэфакты, а магу прыйсці ў даспехах або запрасіць тых, хто прыйдзе на ўрок у касцюмах розных гістарычных эпох», — адказаў малады педагог.

«Як вы разумееце выказванне Жан-Жака Русо: «Мастацтва заключаецца ў тым, каб не выхоўваць»? — працягвалі дапытваць маладога гісторыка вядучыя суперфіналу. «Я разумею выказванне французскага філосафа эпохі Асветніцтва наступным чынам: дзіця само павінна вучыцца, гледзячы на свайго настаўніка. Бо таму ж філосафу належаць і іншыя словы: «Нама нічога больш неразумнага, чым навязваць свой пункт по-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

дзецца сустракаць нямецкую дэлегацыю. Трэба падрыхтаваць некалькі фраз для прыёму гасцей. У нас з вамі на гэта ёсць 10 хвілін», — прапанавала «класу» настаўніца нямецкай мовы з сярэдняй школы № 73 г. Мінска Наталля Грушко. Між іншым, у ролі «вучняў» выступалі калегі-фіналісты, якія хоць і выбылі з барацьбы, але з вялікай ахвотай і гумарам падыгрывалі сваім больш удачлівым канкурэнтам. Прынамсі, нямецкую мову з іх не ведаў ніхто.

— Паверце, кожны з вас ведае як мінімум 8 нямецкіх слоў, і я вам зараз гэта дакажу. А дапаможа мне наша родная беларуская мова, — супакойвала настаўніца. — Teller (талерка), palast (палац), zucker (цукар), farbe (фарбы), pinsel (пэндзаль)...

Вы б толькі бачылі, з якой апантанасцю «вучні» вучылі фразу: «Herzlich willkommen in Belarus».

А на ўроку настаўніка інфарматыкі з Наваполацка Уладзіміра Цымановіча стаяла задача пацвердзіць, што поспех можна... запраграмаваць. Напрыканцы ўрока Віктар Цымановіч даказаў усім, што алгарытмы акружаюць нас на кожным кроку, прывёўшы ў якасці доказу фразы з любімых савецкіх мульцікаў: «Раз ромашка, два ромашка, три ромашка, а я четвёртую сорвал!»; «Входит и выходит, входит и выходит»; «Если я ему подарю цветок, то он его съест»... І агучыў свой алгарытм дасягнення поспеху: ад маладога спецыяліста да паспяховага настаўніка.

МІСІЯ — АДЧЫНЯЦЬ ДЗВЕРЫ

Віктар Жук на сваім уроку гісторыі спачатку прапанаваў класу разгадаць інтэрактыўную крыжаванку, у якой знайшлося месца не толькі Напалеону і Цэзару, але і Чапліну са Сцівам Джобсам і Мерылін Манро. Усе гэтыя людзі вельмі розныя, але кожны з іх у пэўны адрэзак часу пакінуў у гісторыі свой след. Ключом да крыжаванкі аказалася слова «Асоба». Натуральна, што ўрок быў прысвечаны ролі асобы ў гісторыі чалавецтва. Канстанцін Каліноўскі, Давыд Гарадзенскі і Тадэвуш Касцюшка... Чым праславілі гэтыя людзі і якія матывы імі рухалі? Праблем з адказамі не было. «Вучні» цягнулі рукі... Напрыканцы настаўнік прачытаў уласны верш, які адлюстроўвае яго педагагічнае крэда. Сваё прызначэнне ён бачыць у тым, «каб адчыняць дзверы таму, хто ўпарта крычыць «Чаму?»

Апошнім выпрабаваннем суперфіналу стала публічнае выступленне на тэму «З надзеяй, верай і любоўю». Некаторым з канкурсантаў удалося выклікаць у балельшчыкаў і калег не толькі авацыі, але і слёзы... Уладзімір Цымановіч, напрыклад, здолеў расчуліць дзіцячае журы: «Зараз я стаю на парозе значнай падзеі, якая дазволіць пераасэнсаваць многія каштоўнасці і ўмацавацца ў сваіх педагагічных поглядах — я рыхтуюся стаць бацькам. Усё, пра што я цяпер думаю і што адчуваю, я пастараўся выкласці ў лісце да сваёй дачкі». Ліст атрымаўся настолькі кранальным, што можна было толькі паспачуваць канкурсанту, якому давялося выходзіць следам на сцэну. Наталля Грушко напісала верш пра тое, як улюбілася ў сваю будучую прафесію яшчэ ў дзяцінстве і як яна прыйшла ў родную школу ўжо ў якасці педагога. А Віктар Жук распачаў выступленне з прыпавесці:

— Вандроўнік убачыў трох рабочых, якія штурхалі цяжка нагружаныя тачкі. І пацікавіўся ў кожнага з іх, што яны робяць? Першы адказаў, што «штурхае тачку, няхай яна праваліцца». Другі сказаў, што зарабляе на хлеб для сваёй сям'і. А трэці з гонарам вымавіў: «Я будую храм!»

Паводле прызнання Віктара, яго ўласная педагагічная формула заключаецца ў трох кампанентах. Першы — гэта вера ў тое, што яго вучні будуць паспяховымі. Другі — гэта надзея на іх шчаслівую будучыню. І трэці кампанент — гэта любоў да сваёй прафесіі, якая дазваляе выхаваць мысляра і творцу.

ЧАС МАЛАДЫХ

Нельга сказаць, што перамога Віктара Жука ў суперфінале рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года» стала нечаканасцю. Нават нягледзячы на тую акалічнасць, што канкурэнты ў яго былі вельмі моцныя — педагогі з самымі высокімі кваліфікацыйнымі катэгорыямі, — а ў пераможцы педагагічны стаж складае ўсяго тры гады. Аднак ці толькі ў наяўнасці кваліфікацыйнай катэгорыі справа?

Уладзімір Цымановіч: «Складаем алгарытм нашых дзеянняў. Як дабыць у суседа снег летам?»

Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Спачатку сваё рашэнне агучыла дзіцячае журы, якое складалася са старшакласнікаў з усіх рэгіёнаў — пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд і конкурсаў. А на наступны дзень пераможцу абвясцілі дарослае журы, якое ўзначальваў рэктар Беларускага педагагічнага ўніверсітэта Аляксандр Жук. Думкі прафесіяналаў і школьнікаў цалкам супалі!

— Гісторыя вучыць мысліць. Кожны ўрок для дзіцяці павінен быць бітвай за веды, а настаўнік — палкаводцам, які вядзе ўсіх наперад, — канстатуе пераможца. — Безумоўна, на ўроках не абыходзіцца без інтэрактыўных методык: усе варыянты добрыя, галоўнае — захапіць дзяцей, даць ім магчымасць выказаць сваё меркаванне, самім знайсці правільнае рашэнне той ці іншай гістарычнай задачы.

«Я ведаю, якую музыку слухаюць мае вучні, якія фільмы яны глядзяць, чым яны дыхаюць. Як і многія хлопчыкі, люблю гуляць у футбол. Трымаю сувязі са сваімі падапечнымі ў сацыяльных сетках. Усё гэта дапамагае мне знайсці агульную мову з вучнямі, у гэтым і ёсць мой прафесійны сакрэт», — прызнаўся ён сваёй вучаніцы Вікторыі Пажыгайле, якая напісала вельмі цёплы артыкул пра свайго настаўніка ў «Чырвоную змену». Гэта было амаль за паўгода да фіналу конкурсу...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЮБІЛЕЙ ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ

Да 70-годдзя рэгіён падышоў з багатым ураджаем і вялікімі планамі

Чарговая прэс-канферэнцыя старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА адбылася ў Смаргоні з нагоды святкавання 70-годдзя з дня ўтварэння вобласці. З якімі набыткамі сустракаюць на Гродзеншчыне юбілей? Якія праблемы хвалююць і патрабуюць вырашэння?

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ПРЫЯРЫТЭТЫ — САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА, ГІСТАРЫЧНЫЯ АБ'ЕКТЫ

Сёлета ў рэгіёне прадоўжылі даўнюю традыцыю адзначаць юбілейную дату добрымі справамі. Найперш гэта тычыцца ўводу новых сацыяльных аб'ектаў. У аграгарадку Капцёўка малых і іх бацькоў парадавалі новым дзіцячым садам. Ён можа прыняць 75 дзяцей, прычым умовы там не саступаюць гарадскім — утульныя памяшканні, залы для музычных і гурткovых заняткаў, сучасныя кухня, фізіятэрапеўтычны кабінет... Дзіцячая амбулаторыя адкрыта ў гродзенскім мікрараёне Паўднёвы-4 (Альшанка), рэканструявана Правамастоўская ўрачэбная амбулаторыя. А на Смаргоншчыне адноўлена сядзіба Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі.

Праблема ў тым, зазначыў Уладзімір Краўцоў, што развіццё сацыяльнай інфраструктуры, здараецца, адстае ад тэмпаў будаўніцтва жылля. Асабліва ў новых мікрараёнах абласнога цэнтра. Гэтая дыспрапорцыя будзе выпраўляцца: у вышэйзгаданай Альшанцы, адчыніўшы сёлета школу, праз год пабудуюць яшчэ адну. Да наступнага навучальнага года будзе ўведзена школа і ў мікрараёне Вішнявец. Прычым яна спраектавана так, што аб'ектамі для здаровага ладу жыцця змогуць карыстацца не толькі дзеці, але і дарослыя. Надзённыя пытанні будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў будуць вырашацца і ў Шчучыне, Ваўкавыску, іншых рэгіёнах вобласці. У прыватнасці, у Астраўцы, дзе колькасць жыхароў у сувязі з будаўніцтвам АЭС павялічыцца больш чым утрая, да канца года плануецца адкрыць дзіцячы сад на 190 месцаў і школу на 510 вучняў. У перспектыве таксама будаўніцтва дома дзіцячай творчасці, новай раённай бальніцы (існуючая будзе рэканструявана пад паліклініку), ФАКа, школы на 765 вучняў, 2 дзіцячых садкоў, шэрагу аб'ектаў гандлю і бытавога абслугоўвання.

Адным з прыярытэтаў для Гродзеншыны, лічыць Уладзімір Краўцоў, з'яўляецца аднаўленне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і, адпаведна, паляпшэнне турыстычнай прывабнасці рэгіёна. У прыватнасці, у Шчучыне, які ў наступным годзе стане сталіцай Дня беларускага пісьменства, будзе завершана рэканструкцыя палаца Друцкіх-Любецкіх, плануецца аднаўленне і шэрагу іншых аб'ектаў. Пры гэтым разлік не толькі на сродкі бюджэту. У вобласці ўжо ёсць прыклады, калі жаданне вярнуць да жыцця гістарычныя аб'екты праяўляюць буйныя дзяржаўныя структуры (сядзібу ў Свяцку аднаўляе Нацыянальны банк Беларусі) альбо прыватныя інвестары (сядзібы ў Жалудку, Падароску і Поразава). На думку Уладзіміра Краўцова, трэба таксама больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці ўдзелу ў міжнародных праектах трансгранічнага супрацоўніцтва, як гэта зрабілі пры рэканструкцыі сядзібнага дома Агінскіх у Залессі.

НОВАМУ, ПЕРАДАВОМУ — ПАДТРЫМКА ЎЛАДЫ

Сёлета на Гродзеншчыне атрымалі адзін з самых высокіх за гісторыю вобласці ўраджай збожжа — 1 мільён 690 тысяч тон пры сярэдняй ураджайнасці каля 50 цэнтнераў з гектара. А вось вытворчасць свініны ў параўнанні з нядаўнім мінулым скарацілася — па вядомых прычынах. Тым не менш пастаўлена задача, каб ў наступным годзе павялічыць вытворчасць да ўзроўню 2012-га, калі ў вобласці выраблялі чвэрць ад усёй свініны ў краіне. Дзеля гэтага ў Карэліцкім раёне аднаўляюць два комплексы і, акрамя таго, будзе створана племянная ферма з рэпрадуктарам. Улада таксама падтрымае прыватных інвестараў, якія пажадалі пабудаваць на Гродзеншчыне два свінагадоўчыя комплексы на 48 тысяч галоў.

Днямі першую пліту МДФ на новай вытворчасці вырабілі ў ААТ «Мастоўдрэў». Літоўская кампанія Arvi завяршае будаўніцтва ў Лідзе сучаснага прадпрыемства па ўтылізацыі адходаў жывёльнага паходжання, ажыццяўляе буйны праект па вытворчасці мяса індычкі. А ў Ваўкавыску, зноў жа дзякуючы прыватным інвестыцыям, неўзабаве ўвядуць у эксплуатацыю лінію па вытворчасці пладовых напаўняльнікаў для ёгуртаў. Усе новыя праекты з сучаснымі тэхналогіямі атрымаюць дзейсную падтрымку мясцовых уладаў, зазначыў Уладзімір Краўцоў.

Геаграфічнае становішча Гродзеншчыны цікавіць інвестараў і з пункту гледжання развіцця транспартна-лагістычнай сферы. Напрыклад, у Смаргоні ўжо працуе першая чарга ўнікальнага для рэспублікі вытворчага агралагістычнага тэрмінала для перавалкі збожжа, крупаў і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі. Акрамя таго, лагістычныя цэнтры будуць пабудаваны ў раёне пагранічных пунктаў пропуску «Брузгі», «Бераставіца» і «Каменны Лог».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПА СПРАВАХ І ГОНАР

— Гродзеншчына заўсёды вылучалася тым, што літаральна ва ўсіх галінах эканомікі паспяхова вырашаліся многія задачы і ажыццяўляліся самыя амбіцыйныя праекты. Тут жывуць людзі, якія ініцыятыўна працуюць, прапаноўваюць наватарскія ідэі. Рэалізуюцца цікавыя эксперыменты, якія потым становяцца набыткам не толькі ўсёй краіны, але і распаўсюджваюцца за мяжой, — зазначыў **прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** на ўрачыстым сходзе ў Гродне з нагоды 70-годдзя ўтварэння вобласці.

Міхаіл Мясніковіч зачытаў прывітанне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі жыхарам Гродзеншчыны і ўручыў Уладзіміру Краўцову Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, якім ушанавана вобласць Указам кіраўніка дзяржавы. А затым адбылася хвалюючая цырымонія для дзесяці жыхароў Прынёмання, чые імёны занесены ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці.

АХ, ЯК ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА Ў ГАРАДОК

Пасля «Дажынак» у невялікім райцэнтры засталося больш за 160 адноўленых і пабудаваных аб'ектаў

Нягледзячы на тое, што, замест рэспубліканскіх, у Гарадку правялі абласныя «Дажынкі», свята ад гэтага не пацярпела.



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Аляксандр Косінец бярэ ўдзел у адкрыцці трасы для біятланістаў.

БЕЛАРУСКІЯ МАЛЬКІ — У РАСІЮ І ФІНЛЯНДЫЮ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра беларускага ўрада, у Гарадку браў удзел у рабочай сустрэчы з дэлегацыяй Ленінградскай вобласці. Абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва ў аграпрамысловай сферы. Беларускі віцэ-прэм'ер адзначыў, што ўзаемадзеянне ажыццяўляецца паспяхова. І прыклад таму — дзейнасць прадпрыемства «Дзецкасельскі-Гарадок». Дзякуючы апошняму ў Гарадоцкім раёне функцыянуе буйны малочнатаварны комплекс.

— Такіх інвестараў мы будзем падтрымліваць. У той жа час ёсць рэзервы для развіцця сумесных праектаў у племянной рабоце, узаемадзеянні нашых ВНУ і, самае галоўнае, у экспарце беларускіх тавараў, — падкрэсліў Пётр Пракаповіч.

Паводле слоў **Леаніда МАРЫНІЧА, першага намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання**, паўночныя рэгіёны Расіі ахвотна купляюць беларускіх малькоў. Апошнія экспартуюцца і ў Фінляндыю.

НОВЫ БУДЫНАК — ПАЖАРНЫМ

Уладзімір ВАШЧАНКА, міністр па надзвычайных сітуацыях, удзельнічаў у цырымоніі адкрыцця пасля капітальнага рамонту будынка аварыйна-выратавальнай часці. Цяпер выратавальнікі нясуць дзяжурства ў комплексе, які адпавядае ўсім сучасным патрабаванням.

— Сюды была пастаўлена новая, сучасная пажарная тэхніка, якую распрацавалі ў нашым навукова-даследчым інстытуце. Я маю на ўвазе аўтацыстэрну «МАЗ» ёмістасцю 10 тон і каленчаты пад'ёмнік на колах — для ратавання людзей і тушэння пажараў у шматпавярховых будынках, — сказаў міністр.

І ПОМНІК ТАРАСУ...

Падчас падрыхтоўкі да святкавання «Дажынак» зрабілі многае, каб райцэнтр стаў адным з самых прыгожых у краіне, каб сюды прыязджала шмат турыстаў. Усталявалі і помнік галоўнаму герою славутай паэмы «Тарас на Парнасе», аўтар якой родам з Гарадоччыны.

— Новае жыццё атрымалі Дом культуры, кінатэатр, краязнаўчы музей, цэнтральная плошча і мемарыял воінскай славы ля яе... Адрамантавалі жылыя дамы, аб'екты сацыяльнага прызначэння. У час падрыхтоўкі да «Дажынак» будаўнікі працавалі на больш як 160 аб'ектах, — не ўтойвае радасці **Васіль МУРАНКОЎ, старшыня Гарадоцкага райвыканкама**.

Паводле яго слоў, сёлета атрыманы добры ўраджай збожжавых: 27,4 цэнтнера з гектара, агульны намалот склаў 42 тысячы тон.

Аляксандр КОСІНЕЦ, старшыня Віцебскага аблвыканкама, ў ліку іншага наведаў комплекс Віцебскага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па зімовых відах спорту. Ён знаходзіцца ва ўрочышчы «Вераб'ёвы горы». Ва ўтульным гатэлі адначасова могуць спыніцца 75 спартсменаў. Правялі рамонт гульнявай залы. Губернатар даў распараджэнне сёлета адкрыць цір і трэнажорную залу для лыжнікаў. Пастаўлена задача пабудаваць басейн і невялікую лядовую арэну...

Здадзеная да «Дажынак» траса для біятланістаў даўжынёй 5,5 кіламетра — адна з самых складаных у Еўропе. Пасля таго, як яе падоўжаць на 2 кіламетры, тут можна будзе праводзіць і спаборніцтвы па лыжных гонках.

ШЧЫРАЯ ПАДЗЯКА

Падчас цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў абласнога спаборніцтва па ўборцы збожжавых і зернебабовых культур губернатар асабіста падзякаваў лепшым з лепшых.

— Аграрна-прамысловы комплекс вобласці стабільна і планамерна развіваецца. Толькі за апошнія пяць гадоў набылі 15,9 тысячы адзінак новай тэхнікі на суму больш за 4 трыльёны рублёў. Гэта дало магчымасць, нягледзячы на параўнальна цяжкія ўмовы надвор'я, своечасова ўбіраць ураджай, — адзначыў Аляксандр Косінец.

Падчас святкавання адбылося шмат цікавага. Выстава сельскагаспадарчай тэхнікі, свята «Сельская глыбінка», прэзентацыя пад адкрытым небам «Віцебшчына турыстычная»...

«Дажынкі» прайшлі, а тое, што зроблена для ўпрыгожання райцэнтра, застанецца.

І міжволі многім з тых, хто пабываў на свяце, успаміналіся словы з вядомай песні: «Ах, як хочацца вярнуцца ў Гарадок». Так яно і ёсць!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Гарадок — Віцебск.

Фота БЕЛТА.

Святочны каравай.

■ Камуналка

ЯШЧЭ КРЫХУ — І МОЖНА ГРЭЦЦА!

Тэмпература паветра сёлета пакуль трымаецца вышэй за норму, але пры неабходнасці спецыялісты гатовыя правесці ўключэнне ацяплення ў бліжэйшы час. Так, у сацыяльных установах Мінска цяпло ўключаць, калі на працягу пяці дзён усталюецца сярэднясутачная тэмпература паветра, ніжэйшая за 10 градусаў.

«Практычна ўсе спажыўцы і пастаўшчыкі цяпла Мінска гатовы да пачатку ацяпляльнага сезона, — паведаміў **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый ЯНЧЫК.** — З 336 цеплапастаўшчыкоў толькі пяць яшчэ праходзяць працэдуру атрымання пашпартоў».

Згодна з правіламі, цяпло спажыўцам першай групы (да іх адносяцца навучальныя ўстановы, дзіцячыя сады, бальніцы, іншыя медыцынскія і сацыяльныя ўстановы) пачнуць падаваць, калі цягам пяці дзён сярэднясутачная тэмпература паветра будзе складаць менш за 10 градусаў. Што да жылога фонду, то тут ацяпленне ўключаць пры тэмпературы, ніжэйшай за 8 градусаў, якая таксама будзе трымацца на працягу пяці дзён. Сістэма ацяплення рэгулюецца аўтаматычна, у залежнасці ад тэмпературы вонкавага паветра, і, каб яе спыніць пасля запуску, спатрэбіцца 10—14 дзён. Менавіта таму цяпло не падаюць адразу, як толькі ўсталёўваецца ніжэйшая за норму тэмпература.

Паводле слоў Дзмітрыя Янчыка, да зімы гатовы ўсе 6336 дамоў, якія знаходзяцца на абслугоўванні дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», а таксама ўсе жыллёва-эксплуатацыйныя службы сталіцы. Акрамя гэтага, у горадзе створаны неабходныя запасы топачнага мазуту і драўнянага паліва, завяршаецца падрыхтоўка снегаўборачнай тэхнікі, ствараюцца запасы пясчана-салянай сумесі, супрацьгалалёдных рэагентаў.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

К сведению акционеров

ОАО «Современные розничные технологии»

10 октября 2014 года в 09 часов 00 минут по адресу: Минский район, Хатежинский с/с, 1, административно-бытовой корпус, каб.106 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

Повестка дня:
1. О внесении изменений в Устав.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров,будет проводиться по месту проведения собрания с 08 часов 00 минут до 08 часов 45 минут.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт, доверенность.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров Общества, – 08.10.2014.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться в рабочие дни с 09.00 до 16.00 с 03.10.2014 и в день проведения собрания по адресу (место нахождения Общества, проведения собрания): Минский район, Хатежинский с/с, 1, административно-бытовой корпус, каб. 106.

Орган, созывающий внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Современные розничные технологии»: наблюдательный совет.

УНП 690019195 *Наблюдательный совет (телефон: 8 017 500 26 04)*

КЛАСНАЯ КВАТЭРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Самымі знаёмымі для нас і масавымі па краіне з'яўляюцца класы «Эканом» і «Стандарт». Гэта тып жылля масавага попыту, якое арыентавана на задавальненне базавых патрабаванняў спажыўцоў.

«ЭКАНОМ»

Да гэтага класа аднесены 2 тыпы дамоў: 1) усе панэльныя 2) каркасна-блочныя будынкі, дзе на пляцоўцы паверха знаходзіцца больш за 10 кватэр, ці звыш 60% кватэр малой плошчы (да 50 квадратных метраў). Ніякіх асаблівых патрабаванняў да аб'ектаў гэтага класа не прад'яўляецца.

«СТАНДАРТ»

Базавай умовай аднясення дома да гэтага класа з'яўляецца будаўніцтва па тэхналогіі, якая прынцыпова адрозніваецца ад панэльнага домабудавання, і наяўнасць усіх тыпаў кватэр у доме (1-, 2-, 3- і шматпакаёвыя кватэры). Рэкамендаваны для іх памер кватэр па плошчы: 2-пакаёвых — ад 50 квадратных метраў і вышэй, 3-пакаёвых — ад 65 кв. м. У такім доме пакупнік разлічвае ўбачыць бясшумныя ліфты, унутранае і знешняе відэаназіранне, аднак іх наяўнасць не з'яўляецца абавязковай.

Да класа «Стандарт» таксама можа быць аднесены комплекс панэльных дамоў. У гэтым выпадку неабходна наяўнасць у крокавай даступнасці ад яго рэкрэацыйнай зоны, высокая забяспечанасць парковачнымі месцамі і шэраг іншых паляпшэнняў, якія забяспечаць будучым жыхарам комплексу больш камфортныя ўмовы пражывання ў параўнанні з дамамі, якія стаяць асобна. Такімі ўмовамі, у прыватнасці, з'яўляецца існаванне ў комплексу адзінай кіруючай кампаніі, закрытасць тэрыторыі, арганізаваныя там крытыя велапаркоўкі, відэаназіранне і інш.

Аднясенне дамоў да класаў «Камфорт», «Прэстыж» і «Люкс» цалкам выключае магчымасць выкарыстання тэхналогіі панэльнага домабудавання.

«КАМФОРТ»

У дамах гэтага класа колькасць кватэр на лесвічнай пляцоўцы не павінна перавышаць восем. Агульная ж колькасць кватэр у доме не можа перавышаць 400. Для гэтага класа непажаданым становіцца наяўнасць невялікіх кватэр (1-, 2-, 3-пакаёвыя кватэры агульнай плошчай да 40, 60, 80 «квадратаў» адпаведна). Іх доля павінна складаць не больш за 40%. Рэкамендуемая вышыня столяў складае 2,7 метра. Больш увагі таксама надаецца якасці інжынерна-тэхнічнага абсталявання, наяўнасці бясшумных ліфтаў, сістэмы кантролю стану інжынерных сістэм будынка, існавання прафесійнай кіруючай кампаніі. Значнымі фактарамі становяцца аздабленне фасадаў (вітаецца выкарыстанне элементаў штучнага і натуральнага каменю, панарамнага шклення), наяўнасць калясачнай, магчымасць установкі спліт-сістэм і ўнутранае відэаназіранне. Дапускаецца невялікі працэнт кватэр-студый.

Вялікая ўвага надаецца наяўнасці ёмістай паркоўкі. Пры існаванні паркінга на кожныя 4 кватэры павінна прыходзіцца не менш за 3 машына-месцы (з улікам прыдамавой паркоўкі). Адсутнасць крытага паркінга вызначае неабходнасць забеспячэння кожнай кватэры не менш чым 1 машына-месцам. Недапушчальна размяшчэнне ў доме харчовай крамы.

Фота БЕЛТА.

Важным крытэрыем становіцца месцазнаходжанне дамоў класа «Камфорт».

Аптымальным іх размяшчэнне лічыцца ўздоўж галоўных транспартных артэрый горада.

«ПРЭСТЫЖ»

Дапушчальная агульная колькасць кватэр у доме гэтага класа якасці не павінна «пераскочыць» лічбу 250. На кожнай лесвічнай пляцоўцы тут не больш за 4 кватэры. Наяўнасць невялікіх кватэр, у тым ліку кватэр-студый, не павінна перавышаць 20%. Мінімальная вышыня столяў абавязкова складае 2,7 метра. У «прэстыжных» дамах абавязковай умовай з'яўляецца таксама наяўнасць 2 санвузлоў у кватэрах плошчай больш за 110 квадратных метраў (адзін з якіх, як правіла, сумешчаны з ванным пакоем).

Істотна павялічваюцца патрабаванні да інжынерна-эксплуатацыйнага абсталявання, узроўню абслугоўвання і бяспекі, а таксама якасці аздаблення фасадаў, пад'ездаў і лесвічных пляцовак. Наяўнасць крытага ўбудавана-прыбудаванага паркінга робіцца абавязковай: кожная кватэра павінна гарантавана мець не менш за 1 машына-месца.

Патрабаванні да размяшчэння праектаў класаў «Прэстыж» і «Люкс» аднолькавыя: недалёка ад буйных транспартных магістраляў, у крокавай даступнасці ад рэкрэацыйнай зоны (парку, сквера, ракі, лесапаласы). Тут у непасрэднай блізкасці не павінна існаваць ніякіх негатыўных фактараў: прамысловых аб'ектаў, месцаў пахавання, чыгункі і інш.

На першы погляд усё тут, здаецца, і зразумела. Аднак, на практыцы «чыстых» «Камфортаў» і «Прэстыжаў» не вельмі і шмат. Напрыклад, да якога класа трэба аднесці двухпакаёвую кватэру майго знаёмага з агульнай плошчай каля 70 квадратных метраў? Асобна дадам, што ў гэтай кватэры два санвузлы, а кухня мае плошчу 11 квадратных метраў. Адразу здаецца, што гэта і ёсць той самы «Прэстыж», аднак дом у калегі мае панэльнае выкананне...

«ЛЮКС»

Жыллё такога класа павінна мець ужо большую камернасць забудовы. У дамах не вышэй за шэсць паверхаў не прадугледжваецца больш за 48 кватэр, дзе вышыня столяў — ад 3 метраў. Становіцца абавязковым наяўнасць сістэмы кандыцыянавання паветра, а таксама арганізацыі, якая забяспечвае ўстаноўку і падтрымку пакватэрнай сістэмы «разумны дом» пад патрабаванні ўласніка кватэры. Узрастае таксама норма забяспечанасці парковачнымі месцамі — не менш за 3 машына-месцы на кожныя 2 кватэры.

Апошняй умовай «Люксаў» з'яўляецца карэкціроўка ўсіх дадатковых функцый у доме (паслугі, сэрвіс, гандлёвыя памяшканні), што патрабуе абавязковага ўзгаднення з жыхарамі дома.

«НЕАФІЦЫЙНЫ» ЎЗРОВЕНЬ

У рамках класіфікацыі жылых новабудоўляў выкарыстоўваецца 23 крытэрыі, якія вызначаюць класнасць таго ці іншага аб'екта. Аднак гэтая градацыя пакуль нікім і нідзе афіцыйна не зацверджана.

Спецыялісты кампаніі «Твая сталіца» адзначаюць, што першапачаткова і не планавалася адразу замацоўваць класіфікацыю ў заканадаўстве, ставіць рынак у нейкія рамкі. Ніхто не збіраецца навязаць рынку абавязковую класіфікацыю. Тут прапануецца інструмент, з дапамогай якога забудоўшчык зможа зрабіць свой праект найбольш эфектыўным. Калі ўжо казаць аб замацаванні гэтай класіфікацыі на заканадаўчым узроўні, то для пачатку трэба паназіраць за рынкам, паглядзець, як яна будзе працаваць на практыцы.

Насамрэч зацвердзіць класіфікацыю ў Дзяржстандарце не так ужо і складана. Але пасля гэтага будзе значна цяжэй уносіць у яе змены.

«ЛЮКС» — ТОЛЬКІ Ў ДАКУМЕНТАХ

Згодна з інфармацыяй сталічных рыэлтараў, напярэдадні лета на першасным рынку жылля клас «Стандарт» у Мінску з'яўляецца самым масавым: да яго адносіцца 61% усіх аб'ектаў, якія рэалізуюцца на рынку. Доля класа «Эканом» складае 15%, «Камфорт» і «Прэстыж» — 18% і 6% адпаведна. Дамоў класа «Люкс» у нашай краіне ўвогуле няма.

Сяргей КУРКАЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки»
(организатор аукциона) по поручению ОАО «МЗОР» – управляющая компания холдинга «Белстанкоинструмент» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 16 в составе:

ЛОТ № 1: административно-бытовой корпус, об. пл. 702,8 кв.м, инвентарный номер 500/С-45993. **Начальная цена с НДС – 14 448 204 000 бел. руб.**
ЛОТ № 2: производственный корпус, об. пл. 4157,2 кв.м, инвентарный номер 500/С-45994. **Начальная цена с НДС – 62 839 524 000 бел. руб.**
ЛОТ № 3: производственный корпус, об. пл. 1115 кв.м, инвентарный номер 500/С-45995.
Начальная цена с НДС – 21 373 452 000 бел. руб.
ЛОТ № 4: производственный корпус, об. пл. 886,1 кв.м, инвентарный номер 500/С-45996.
Начальная цена с НДС – 17 492 628 000 бел. руб.

Объекты недвижимости расположены на неделимом земельном участке пл. 9,5789 га предоставленным продавцу на праве временного пользования (по 31.12.2019) для эксплуатации и обслуживания производственных зданий и сооружений завода с ограничением – водоохранная зона реки Свислочь.
Объекты недвижимости обременены договорами аренды. Справочную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
Лоты №№ 1–4 являются историко-культурной ценностью, в связи с чем новый собственник имущества обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство.
Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.
Условия оплаты: если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **20** (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится 31.10.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2014** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.
Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона) по поручению ОАО «Рапс» (продавец) проводит открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества в составе:

Настоящие правила проведения рекламной игры «**ГИППО + Махеев. Вкусно каждый день!**» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под товарным знаком «Махеевъ», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «**ГИППО + Махеев. Вкусно каждый день!**» (далее – Рекламная игра).

1. Организатор

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Студия Пушкаревой», УНП 192215032, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192215032 (далее – Организатор). Местонахождение Организатора: 220050, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 18, комн. 206 «А».

Заинтересованным лицом является Общество с ограниченной ответственностью «Владпродимпорт», зарегистрированное 25 июля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101308387; местонахождение: 220036 г. Минск, ул. Западная, 11 «А», УНП 101 308 387 (далее – Заинтересованное лицо).

2. Участники Рекламной игры

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры (далее – Участник) не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

3. Название Рекламной игры: «ГИППО + Махеев. Вкусно каждый день!»

Территория и место проведения Рекламной игры: Рекламная игра проводится в объектах розничной торговли «ГИППО» на территории Республики Беларусь, а именно в объектах розничной торговли, расположенных по адресам, указанным

Таблица 1:

г. Минск	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, пр-т Рокоссовского, 2
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Горецкого, 2
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Городецкая, 30
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Сухаревская, 31
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, Игуменский тракт, 30
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 3
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Червякова, 57
Минский район	Магазин «ГИППО» по адресу: Минский район, д. Боровая
г. Гомель	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Гомель, ул. Косарева, 18
г. Могилев	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Могилев, ул. Мовчанского, 6

4. Срок начала Рекламной игры: 02 октября 2014 г.

5. Срок окончания Рекламной игры: 26 декабря 2014 г.

6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:

все товары, выпускаемые под товарным знаком «Махеевъ», реализуемые в магазинах «Гиппо».

8. Призовой фонд Рекламной игры

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица в размере **94 059 695** (Девяносто четыре миллиона пятьдесят девять тысяч шестьсот девяносто пять) белорусских рублей. Призовой фонд рекламной игры включает следующие призы:

№ п/п	Наименование приза	Кол-во, шт.	Стоимость, бел. руб.	Общая стоимость с НДС, бел. руб.
1	Главный приз: Изготовление и монтаж кухни по индивидуальному дизайн-проекту (далее «Кухня»)	1	50 000 000	50 000 000
	денежное вознаграждение	1	6 850 000	6 850 000
2	Система очистки воды «АО», АО RO 6	5	1 930 020	9 650 100
	Денежное вознаграждение	5	160 975	804 875
3	Блендер BOSCH MSM6B150	100	267 547,2	26 754 720

9. Порядок участия в Рекламной игре, определения Победителей и получения призов:

9.1. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 02 октября 2014 г. до 02 декабря 2014 г. (включительно) совершить совокупность следующих действий:

9.1.1. Единовременно (удостоверяется одним кассовым чеком) приобрести в объектах розничной торговли «ГИППО» (Таблица 1) не менее двух единиц товара (в любом сочетании) под товарным знаком «Махеевъ».

9.1.2. Зарегистрироваться на Интернет-сайте www.gippo.by, заполнив регистрационную форму, содержащую для заполнения обязательные поля: фамилия, имя (полностью), отчество (полностью); адрес места жительства: почтовый индекс, область, район, населенный пункт, улицу, дом, номер квартиры; контактный номер телефона; номер кассового чека, который находится в верхней части кассового чека под наименованием «Док No»; дата кассового чека; адрес магазина «ГИППО», e-mail.

Доступ к Интернет-сайту www.gippo.by предоставляется без взимания платы и заключения договора лицом, являющимся владельцем этого сайта.

После регистрации Участник получает уведомление об успешной регистрации либо об ее отклонении в случае повторно введенного номера кассового чека или нарушения порядка и условий регистрации, установленных настоящими Правилами.

Один кассовый чек может принимать участие в Рекламной игре только один раз. В том случае, если номер кассового чека будет введен более одного раза, он будет приниматься только один раз по факту первого ввода номера кассового чека.

9.2. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки товаров, выпускаемых под товарным знаком «Махеевъ», в необходимом количестве и выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

9.3. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры при вводе регистрационных данных, и за достоверность сведений, указанных при регистрации на Интернет-сайте.

9.4. Организатор не вступает в спор в случае возникновения вопросов об определении достоверности регистрационных данных того или иного лица. Все Участники должны сохранить чек, подтверждающий покупку товаров под товарным знаком «Махеевъ» до окончания Рекламной игры.

9.6. Розыгрыш призов проводится Организатором Игры **15 декабря 2014 г. в** 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 18, офис 206 А.

9.7. На каждый зарегистрированный чек на Интернет-сайте www.gippo.by оформляется одна карточка, которая содержит порядковый номер и ФИО Участника. Порядковый номер Участника присваивается по дате и времени регистрации в порядке очередности. Все карточки засыпаются в лототрон, размещенный в офисе 206 А по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 18. Карточки перемешиваются. Оглашается первый приз, который разыгрывается. Затем из лототрона достается карточка с номером Участника. Этот Участник выиграл оглашенный первый приз и т.д. Таким образом разыгрываются все призы.

9.8. Организатор связывается с Победителем по указанному в регистрационной форме номеру телефона и отправляет по указанному в регистрационной форме адресу заказное письмо с уведомлением не позднее **17 декабря 2014 года**.

9.9. Победители могут явиться **23 декабря 2014 года** к 19.00 в магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Горецкого, 2 на торжественную церемонию, посвященную вручению сертификатов на получение Призов.

9.10. В случае если Победитель не явился 23 декабря 2014 года к 19.00 в магазин «ГИППО» на торжественную церемонию, то для получения Приза или для написания заявления о передаче права на Главный приз любому лицу, Победитель должен явиться по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 18, офис 206 «А» с паспортом и кассовым чеком (оригинал), подтверждающим покупку, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону 8 (029) 1 943 943 **не позднее 17.00 26 декабря 2014 г.**

Победитель должен предъявить сертификат на Кухню в компанию ООО «Лигаинвест» по адресу: г. Минск, ул. Карвата, д. 87/2 **не позднее 26 января 2015 г**. Изготовление и монтаж кухни производится в течение 45 дней с момента фактического предъявления Победителем выигранного в Рекламной игре «ГИППО+Махеевъ. Вкусно каждый день!» сертификата в компанию ООО «Лигаинвест».

9.11. В случае если Призы не получены в установленные Правилами Рекламной игры сроки, либо с Победителями не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных при регистрации, Призы передаются Организатором Заинтересованному лицу.

9.12. В соответствии с п.1.19 ст. 163 Особенной части Налогового кодекса Республики Беларусь при выдаче призов, стоимость которых превышает 10 базовых величин, в адрес одного участника Организатор удерживает и перечисляет подоходный налог с суммы приза, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Обязательства по уплате подоходного налога в связи с получением приза, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, полностью возлагаются на организатора Рекламной игры. Денежные средства, указанные в призовом фонде, будут использованы организатором для уплаты подоходного налога.

10. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры

10.1. Правила Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Игры.

10.2. Результаты Игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок по 26 декабря 2014 г.

10.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте www.gippo.by, а также по телефону (375 29) 1 943 943. Звонок платный, в соответствии с тарифами оператора, которым пользуется Участник.

11. Комиссия по проведению Игры, регламент деятельности

11.1. Для контроля над соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрения спорных случаев, принятия решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникших при проведении Рекламной игры, Организатор создает комиссию в составе 5-ти человек:

1. Думанская Наталья Петровна, заместитель директора по маркетингу ООО «Владпродимпорт»;

2. Жагунь Ольга Евгеньевна, главный специалист по реализации программы лояльности Иностранное унитарное предприятие «БелВиллесден»;

3. Петрашенко Дмитрий Владимирович, заместитель директора по коммерческим вопросам ООО «Владпродимпорт»;

4. Киселева Ирина Михайловна, директор ООО «Студия Пушкаревой»;

5. Болтач Наталья Валерьевна, главный бухгалтер ООО «Студия Пушкаревой».

12. Прочие условия

12.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

12.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

12.3. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет (например, плохое соединение с провайдером, поломки в сети и т.д.).

12.4. Организатор оставляет за собой право произвести экспертизу чеков, предъявленных Победителями Рекламной игры, для определения их подлинности.

Все чеки, по которым получены Призы, передаются Организатору и возврату Участникам не подлежат.

12.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

12.6. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: ул. Комсомольская, 18, офис 206 «А».

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2423, зарегистрированной 02.09.2014 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Ігуменскі тракт
№ 30 (88)

■ Дзеля памяці

У ЖДАНОВІЧЫ. НА СУСТРЭЧУ З БЫКАВЫМ

Прайшлі святочныя дні. Згубілася за іншымі клопатамі і падзеямі інфармацыйная нагода згадваць і юбілей Васіля Быкава, і нядаўняе адкрыццё музея на дачы пісьменніка ў Ждановічах. А між тым...

Так, а між тым нагода ўсё ж ёсць. Пройдуць цёплыя восеньскія дзянькі. І музей закрыюць. Аказваецца, музей павінен працаваць з мая па верасень уключна — такія ўмовы работы філіяла «Музей-дача Васіля Быкава ў Ждановічах» Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Галоўная прычына сезоннай працы — адсутнасць патрэбных умоў: дом вельмі халодны (дарэчы, і Быкавы ніколі ці амаль ніколі не начавалі тут, прыязджалі, як правіла, на дзень), ацяпляць яго можна, толькі добра напаліўшы печ.

Фотаздымкі Наталлі АСМОЛА.

Але супрацоўнікі музея — загадчык філіяла журналіст і пісьменнік Алесь Гібок-Гібкоўскі *(на здымку)* і малодшы навуковы супрацоўнік Ірына Часнок — вырашылі, што было б несправядліва закрываць музей, які зусім нядаўна адчыніў свае дзверы. І Алесь Сямёнавіч вядзе нас, праўда, да дрывотні, дзе загадзя да халадоў нарыхтаваны дровы, якія ахвяраваў спецыяльна для музея беларускі фермер з-пад Ракава Валерый Гараўцоў. Дзякуючы гэтаму музей пры неабходнасці мае магчымасць прадоўжыць працу яшчэ і ў кастрычніку-лістападзе.

Разам аглядаем сядзібны ўчастак. Шмат сталага веку бяроз. Аказваецца, што яны раслі тут яшчэ да ўзвядзення дома. Адну з іх падчас будаўніцтва зачапіў экскаватар. Але пісьменнік выхадзіў дрэва. І зараз гэтая бяроза таксама расце на ўчастку.



Алесь Сямёнавіч распавядае пра суседзяў, якія жывуць ці жылі побач:

— Заходзіць да нас у госці кампазітар Ігар Лучанок. Частым госцем стаў і яго сын Андрэй. А насупраць — дача вядомага музыканта Аляксандра Мільто і яго сястры Ірыны, якая шмат гадоў аддала працы на Беларускім радыё. Яны вельмі цёпла сябравалі з сям'ёй Быкавых. Сярод экспанатаў, матэрыялаў, сабраных у філіяле, і паштоўкі, падораныя гэтымі людзьмі, адрасаваныя ім ад Быкавых.

Алесь Гібок-Гібкоўскі ў гасцёўні дачы звяртае ўвагу на вялікую грампласцінку «И пока на свете существует любовь». На канверце чытаем: «Мой родны кут, як ты мне мілы... Дарагім Ірыне Міхайлаўне і Васілю Уладзіміравічу. Жадаю толькі здароўя на радасць добрым людзям. 22-XI. 88 г. Ігар Лучанок». На пласцінцы — «Майскі вальс», «Здымак у газеце»... Можа быць, гэтыя запісы гучалі, калі на дачу да Быкавых завітвалі Віктар Астаф'еў, Валянцін Аскоцкі, Ігар Дзядкоў, тыя з пісьменнікаў і крытыкаў, якія не аднойчы размаўлялі з аўтарам «Мёртвым не баліць» пра пякучыя памяткі вайны?..

На дачы — шмат мастацкіх твораў. Гэта і выдатныя малюнкі самога пісьменніка, і работы Наталлі Паплаўскай, Валерыя Славука, Віталя Дударэнкі. У пакоі Васіля Уладзіміравіча — сёння ўжо амаль антыкварная — пішучая машынка. І — паліцы з кнігамі. Кідаецца ў вочы, што ў Ждановічах сабрана нямала выданняў твораў Быкава на замежных мовах. Але сярод іх — і кнігі, якія браліся на адпачынак з разлікам на чытанне. Гэта відавочна. Непрачытаная кніга вылучаецца, яна сама за сябе гаворыць, што яе старонкі не гарталіся. Вось зборнік крытыкі, эсэ, эпісталярыі Веніяміна Каверына «Пісьмовы стол». На аванцітуле: «Дарагому Васілю Уладзіміравічу — з удзячнасцю за ўсё, што вы зрабілі для нашай літаратуры. В. Каверын. 29/III 1985». У гэтым невялікага памеру томіку — і кароткае, але яркае эсэ прысвечана Васілю Уладзіміравічу. Гартаю кнігу «ваенвыдатаўскай» серыі «Ваенныя мемуары» — «Атаку пачыналі танкісты». Аўтар — генерал арміі Я. Іваноўскі. Ёсць у аўтографе славутага генерала і такія словы: «...З удзячнасцю за Вашу праўду і шчырасць пра вайну...» Напісана ў 1984 годзе. Тады не мінула яшчэ і двух дзесяцігоддзяў, як шмат хто з генералаў лупіў словамі па пісьменніку і па зробленым ім. Дзякуй таму ваеначальніку, які падзякаваў Васілю Быкаву, няхай сабе ўжо ў 1984-м — Герою Сацыялістычнай Працы, прызнанаму ва ўсім свеце пісьменніку — за праўду і шчырасць.

Гартаем старонкі кнігі Івана Ласкова «На падводных крылах» з яго цёплым аўтографам Васілю Уладзіміравічу. Хаця і выйшла яна ў Мінску, а належыць пяру чалавека, які доўгі час правёў за межамі Беларусі. Іван Ласкоў — пісьменнік няпростага лёсу, гранічна шчыры і адкрыты чалавек. Такія, відаць, болей за ўсё і цягнуліся да Быкава. Як і Уладзімір Караткевіч, чый падарунак — вялікая карціна на гістарычную тэму — захоўваецца ў мансардзе.

Дарэчы, мансарда да дачы была прыбудавана пазней, чым асноўны дом. І пабудаваў яе сваімі рукамі пісьменнік Ганад Чарказян. «Васіль Уладзіміравіч сапраўды адчуў сябе ўтульна, калі ўзвялі мансарду, якая заўжды была напоўнена сонцам, — расказвае загадчык філіяла. — І ствараючы музейную экспазіцыю, мы пастараліся гэта падкрэсліць. Зразумела, што дача, якая будавалася з падтрымкай сакратара ЦК КПБ Аляксандра Кузьміна, узводзілася якраз з той мэтай, што тут ніхто не будзе дакучаць, тут будзе адпаведная працы атмасфера. Але ў выніку пісьменніку на дачы не вельмі працавалася. У адным са сваіх запісаў ён згадвае: «Не пісалася мне на дачы, усё тут шкодзіла — і размовы суседак побач, і брэх сабак, і дзіцячая гамана з піскам і крыкам...» І Васіль Уладзіміравіч болей проста адпачываў на лоне прыроды. Але ж ёсць і такая яго згадка ў кнізе «Доўгая дарога дамоў» пра 26 красавіка 1986 года, калі здарылася аварыя на Чарнобыльскай станцыі: «... сядзеў на дачы і замест таго, каб паліваць ружы, пісаў нейкі артыкул...».

Можа быць, песні Ігара Лучанка гучалі, калі на дачу да Быкавых завітвалі Віктар Астаф'еў, Валянцін Аскоцкі, Ігар Дзядкоў.

У мансардзе цяпер ужо як экспанаты ляжаць часопісы «Огонёк», газета «Неделя», «Новый мир» з «Архіпелагам ГУЛАГам» Салжаніцына, нумар «Военно-исторического журнала», шмат газет таго часу, да якіх дакраналася рука Васіля Уладзіміравіча....

У музея-філіяла — яшчэ першыя месяцы жыцця. Магчыма, некалі напішуць і яго дакладную гісторыю. Але ўжо сёння ясна адно: каб болей спасцігнуць сутнасць творчага лёсу вялікага пісьменніка, класіка нацыянальнай літаратуры, нельга абмінуць гэты яго адрас колішняга жыцця. Што і раім зрабіць усім, хто неабыякавы да самой згадкі пра Васіля Быкава. Едуць жа ў Ждановічы з Санкт-Пецярбурга, Ніжняга Ноўгарада, Масквы... То не абмінуць варта і нам, беларусам. Дзверы музея-філіяла ў Ждановічах адчынены з 11.00 да 17.00 у сераду, чацвер, пятніцу, суботу і нядзелю.

Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ

ЛІСТ ПЯРОМ КОЛАСА ДЫ ХЛЕБ З ЖАЛУДОЎ

Супрацоўнікі музеяў прываблівающь наведвальнікаў нетрадыцыйнымі спосабамі

Нашы музеі ў бліжэйшай перспектыве павінны забыць пра бюджэтнае фінансаванне і з годнасцю існаваць ва ўмовах рынку. Пра гэта і не толькі ішла размова на другім нацыянальным форуме «Музеі Беларусі», які прайшоў у Гомелі.

Дзеці з задавальненнем выкладвалі з вялізных кубікаў выявы палотнаў вядомых беларускіх мастакоў, праз спецыяльныя акуляры разглядвалі 3D-малюнкі, з дапамогай сучасных тэхналогій стваралі арыгінальныя інсталяцыі. Дарэчы, і дарослыя не адставалі. Цяга фатаграфавацца з касцюміраванымі героямі розных эпох была поўнасцю задаволена арганізатарамі мерапрыемства. Невялічкія перасоўныя выставы прадставілі каля 100 дзяржаўных, ведамасных і грамадскіх арганізацый, а таксама кампаній, якія працуюць у сферы музейных тэхналогій і індустрый. Былі на форуме і экспанаты, якія можна было з'есці ці выпіць. На тэрыторыі «зямлянкі» Гомельскага музея ваеннай славы, напрыклад, частавалі тушонкай, жодзінцы давалі пакаштаваць хлеб, выпечаны па партызанскіх рэцэптах — з дадаткамі траў і жалудоў. А вось спецыялісты шклоўскага краязнаўчага музея спакушалі «агуркоўкай» і салам на шпажках.

Напісаць пісьмо з патаемным жаданнем пяром класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа — калі ласка! Надрукаваць паштоўку з уласнай выявай — не праблема! Вылепіць на ганчарным крузе глечык — з задавальненнем! **Ганна КУЗЬМІЧ, загадчыца аддзела па зборы музейных матэрыялаў і экспазіцыйнай дзейнасці Гомельскага палацава-паркавага ансамбля,** гаворыць, што інтэрактыўныя заняткі — не толькі выставачны праект. На працягу апошняга года ў музей прыходзяць школьнікі малодшых класаў, каб у форме гульні больш даведацца пра гісторыю роднага краю. Дзеці разгадваюць тэматычныя крыжаванкі, вырабляюць сваімі рукамі паштоўкі, а потым прыводзяць у музей сваіх бацькоў. І тут высвятляецца, што не ўсе з іх здагадваліся аб наяўнасці такой магчымасці культурна ўзбагаціцца:

— Гэты праект разлічаны на далёкую перспектыву і аддачы заўтра ад яго цяжка чакаць. Але ж, спадзяюся, такім чынам нараджаецца інтарэс да гісторыі свайго краю, у нашым грамадстве будзе больш культурных і адукаваных людзей. Мы верым, што яны потым сваіх нашчадкаў да нас у музей прывядуць.

Шмат размоў было і наконт інфраструктуры, якая існуе пры многіх еўрапейскіх музеях: гэта і кавярні, і крамы, і ліфты з пандусамі для інвалідаў... **Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір ПРАКАПЦОЎ** гаворыць, што гандлёвыя ваколмузейныя ўстановы могуць прыносіць ад 40% да 60% прыбытку:

— Але ж справа ў тым, што наш музей быў пабудаваны ў 1957 годзе, калі ніхто не думаў пра адпаведную інфраструктуру. Сапраўды, у Еўропе чалавек, які зайшоў у музей, без сувеніра адтуль не выйдзе, хаця б паштоўку з выявай любімай карціны купіць. У нас таксама ўсё гэта будзе. Нядаўна, напрыклад, мы замовілі арыгінальныя сувеніры на парцалянавым заводзе ў Добрушы.

Падчас форуму прайшлі лекцыі, дыскусіі, трэнінгі і майстар-класы з удзелам вядомых прафесіяналаў у вобласці музеялогіі і музейнай дзейнасці Беларусі, Расіі, Германіі, Славакіі і Літвы. **Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ** адзначыў, што музеі павінны прырастаць не столькі колькасна, колькі якасна:

— Галоўнае, на мой погляд, не тое, якім чынам глядач атрымлівае інфармацыю, а якую інфармацыю ён атрымлівае. Музей — сродак выхавання, і самае галоўнае — якая канцэпцыя закладзена ў кожную музейную экспазіцыю. Гэтая канцэпцыя павінна адпавядаць часу. Наша задача — знайсці адпаведныя тэхнічныя сродкі, каб гэтую канцэпцыю данесці.

Спецыялісты шклоўскага краязнаўчага музея спакушалі «агуркоўкай» і салам на шпажках.

Незвычайныя і глыбокія канцэпцыі ўласцівыя заўсёды экспазіцыям Веткаўскага музея старавераства і беларускіх традыцый. Таму невыпадкова, што **дырэктар гэтай установы Галіна НЯЧАЕВА** была прызнана лепшым кіраўніком музейных устаноў краіны. Гран-пры конкурсу «Музеі Беларусі — трэцяму тысячагоддзю» атрымаў Нацыянальны

мастацкі музей у намінацыі «Лепшае ўяўленне музея на экспазіцыі форуму». У намінацыі «Лепшае навуковае праектаванне экспазіцыі форуму» вышэйшай ацэнкай адзначана работа Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, прысвечаная гісторыі Брэстчыны са старажытных часоў да першай чвэрці XX стагоддзя. У намінацыі «Лепшае мастацкае праектаванне» пераможцам прызнана экспазіцыя Ашмянскага краязнаўчага музея імя Францішка Багушэвіча.

У якасці ганаровага госця і сустаршыні журы на форуме прысутнічаў дырэктар Дзяржаўнага Эрмітажа Міхаіл Піятроўскі. Шаноўнаму госцю з Санкт-Пецярбурга на цырымоніі закрыцця ад гомельскіх кандытараў дастаўся адмысловы торт з малюнкам будынкаў Эрмітажа і гомельскага палаца Румянцавых-Паскевічаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

■ Справа жыцця

Леанід ЛАЎРЭШ:

«КОЖНАЯ ЗНАХОДКА — НАГОДА ДЛЯ РАДАСЦІ»

ГІСТОРЫЯ Лідчыны добра даследавана: ужо шмат што напісана і выдадзена па ёй. Сёння многае з гэтага акумулюецца на інтэрнэт-рэсурсе pawet.net. Яго стваральнік, рэдактар і пастаянны аўтар — мясцовы краязнавец Леанід Лаўрэш. Але ён не толькі размяшчае свае публікацыі ў інтэрнэце, але і рэгулярна атрымлівае ў выдавецтвах уласныя папяровыя кніжкі. Для яго даследаванне Ліды — справа жыцця, любімы занятак. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з Леанідам Лаўрэшам, калі на вуліцы ішоў надакучлівы дождж. Таму мы не сталі блукаць па старажытных вуліцах, а проста пагутарылі пра надзённае, размясціўшыся так, каб здаля быў відаць Лідскі замак...

— У вашай кнізе «Ліда ўчора і сёння: гісторыя горада ў выявах» змяшчаецца шмат старых чорна-белых фотаздымкаў. Як адшукалі такую колькасць архіўнага матэрыялу?

— Я маю вялікую зацікаўленасць да паштовак старога горада. У 2001 годзе была выдадзена брашура з некаторымі з іх — ужо тады я меў пэўную калекцыю гэтых паштовак. Калекцыя то разыходзілася, то збіралася зноў, аднак у электронным выглядзе захоўвалася заўсёды. Ствараючы кнігу пра Ліду, мы палічылі, што будзе цікава не толькі штосьці напісаць, але і даць шмат ілюстрацый. Надрукаваць побач старыя выявы і сучасныя фотаздымкі было немагчыма, бо горад вельмі змяніўся: ён амаль цалкам згарэў на пачатку вайны 22 чэрвеня 1941 года. Ад колішняга цэнтра старога горада захавалася толькі сцяна яўрэйскай школы і два касцёлы (адзін з іх цяпер дзейнічае як царква) — тым цікавей гэта ўсё вывучаць.

— Кім працуеце? І ці хапае вольнага часу на актыўную краязнаўчую працу, на сталае выданне ўласных кніг?

— Я інжынер, вольнага часу сапраўды нестае. Аднак кнігі пісаліся не тое што адна за адной, па чарзе, — усё гэта было створана значна раней, чым выдавалася. Былі нарыхтоўкі.

— Як сям'я ставіцца да вашага захаплення краязнаўствам?

— Сын ужо дарослы, жыве ў Варшаве, працуе праграмістам і зарабляе нашмат больш, чым тата. Жонка ў мяне чалавек разумны *(усміхаецца)*, ёй самой усё гэта цікава. Вядома, каб не яна, у мяне нічога б не атрымалася. У маёй чацвёртай кнізе з нарысамі гісторыі астраноміі, выдадзенай «Лімарыусам", змешчана прысвячэнне жонцы. Каб жонка мяне не падтрымала, не ўзяла на сябе частку працы па хаце, мне было б значна цяжэй. Таму з ёй мне пашанцавала.

— Вы займаліся даследаваннямі роду сваёй жонкі. А ўласны радавод таксама вывучалі?

— Мае продкі былі вясковымі людзьмі, а сялянскі род даследаваць вельмі цяжка. Шляхта тастаменты пэўныя пісала, у войнах удзельнічала, на замежныя суды ездзіла — адшукаць іх сляды лягчэй. Таму грунтоўную публікацыю планую падрыхтаваць пра радавод жонкі (прозвішча Хруль герба Праўдзіц).

— Раскажыце, якія самыя цікавыя знаходкі ўдалося зрабіць за часы краязнаўчых пошукаў?

— Калі ты ў тэме і знаходзіш нават невялікую дробязь — пэўны цікавы радок, адзін фотаздымак, то можаш цэлы тыдзень хадзіць у захапленні. Днямі ў інтэрнэце я праглядаў невялікую кніжку на польскай мове, якую зусім нядаўна туды выклалі. У ёй я знайшоў выяву лідскага старосства (раней павета), якое знаходзілася ў старым кармеліцкім кляштары, — 1945 год ён «не перажыў». Выяў гэтага кляштара амаль не захавалася. А тут я адшукаў адразу дзве ілюстрацыі — гэта было надзвычай цікава! Я адразу апрацаваў і захаваў сваю знаходку. У другой маёй кніжцы апісаны лёс генерала Кіпрыяна Кандратовіча. Раней пра яго толькі ў энцыклапедыі было напісана 5-6 радкоў (з іх 2 — непраўдзівыя). Таму я фактычна першым «раскапаў» гісторыю гэтага чалавека з нуля.

— Пасля таго, як кнігі паступілі ў масавы продаж, ці змянілася стаўленне вашых калег, ці з'явілася дадатковая ўвага?

— Беларускія кніжкі цяпер друкуюць невялікім накладам. Як кажуць: «Усе мы шырока вядомыя людзі ў вузкіх колах» — таму нельга сказаць, што я займеў нейкую папулярнасць з-за сваіх кніг. А вось шостая кніга выходзіла пры садзейнічанні «Лідскай газеты». У ёй ужо два гады раз на два месяцы друкуецца мая паласа па гісторыі Ліды — вось гэта многіх здзівіла: тых, хто быў са мной добра знаёмы, але не ведаў, што я займаюся «невядома чым» *(усміхаецца)*. Напачатку не ўсе разумелі гэта, але іншыя ставіліся станоўча, казалі, што чыталі і ім цікава (цяпер увогуле няшмат тых, хто можа адолець цэлую газетную паласу). Мой сайт pawet.net штодзень наведвае каля 2500 — таму на паперу я вельмі не разлічваю — усё ідзе ў інтэрнэт.

— Як бы вы акрэслілі, навошта ўвогуле сучаснаму чалавеку ведаць гісторыю свайго краю?

— Па-першае, без уласнай беларускай версіі падзей не будзе самой Беларусі — ні дзяржавы, ні народа. Аднак пра такія высокія матэрыі я не думаю, а займаюся гэтым проста таму, што мне цікава (калі пачало нешта атрымлівацца, стала яшчэ цікавей!). І проста веру, што, калі мне трэба знайсці пэўны гістарычны матэрыял і выдаць па ім кніжку, так яно і будзе. У нашай краіне выдатныя прафесійныя гісторыкі і высокага класа аспіранты. Яны яшчэ сябе праявяць, бо адкрываецца шмат невядомага раней, і мы будзем мець вельмі цікавую гісторыю.

— Колькі на вашым рахунку ўжо кніжак па краязнаўстве?

— Цяпер 6-я выйшла. І 2 падрыхтаваны да друку: першая пра Мала-Мажэйкаўскую царкву, другая — пад умоўнай назвай «Тры паўстанні на Лідчыне» (1812, 1831 і 1863 гады). На друк кнігі пра царкву грошы ўжо знайшліся. На выданне другой адзін чалавек шукае для мяне фінансы. Бо ў мяне ёсць такі прынцып — не выдаваць кнігі за свае сродкі. Да таго ж я апублікаваў каля 120 артыкулаў.

— Дзе ўсё-такі бераце грошы на выданне сваіх прац?

— Кнігу пра Вандаліна Шукевіча надрукавалі ў выдавецтве «Харвест»: яна выйшла невялікім фарматам у іх серыі «100 асоб Беларусі». Я нават ганарар за яе атрымаў, не тое што траціў свае сродкі. Кнігу пра гісторыю Ліды выдалі гарадскія ўлады (дзякуй ім за гэта вялікі!) як мясцовы праект. Кнігу пра грэка-ўніяцкую царкву на Лідчыне надрукавалі грэка-ўніяты. Вось вам і крыніцы фінансавання. А на ўсё астатняе грошы не патрэбны: толькі камп'ютар, асабістая зацікаўленасць і вольны час.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Лідскі раён

АДРАДЖАЮЧЫ ШЛЯХ «З ВАРАГАЎ У ГРЭКІ»

Напрыканцы верасня на беразе Нёмана можна было сапраўды трапіць у Сярэднявечча. У Бярозаўцы Лідскага раёна стартаваў фестываль «З варагаў у грэкі». Пры музеі «Панёманскае гарадзішча» быў пабудаваны баявы карабель эпохі вікінгаў, што стала дастаткова незвычайнай падзеяй не толькі для мясцовых жыхароў, але і для шматлікіх гасцей з іншых гарадоў. Фестываль пачаўся якраз са спуску ладдзі на ваду.

Ажыццявіць такі праект удалося траім энтузіястам з Ліды — Дзмітрыю Вараноўскаму, Аляксею Карандзею, Паўлу Дарафею. Карабель пабудавалі ў адпаведнасці з чарцяжом, які хлопцы атрымалі з дацкага музея. Ён максімальна падобны на арыгінал эпохі ранняга Сярэднявечча — нарвежскае судна вікінгаў «Гокстад». Даўжыня яго — амаль 14,5 м, шырыня — 3 м, вышыня мачты — 7,5 м.

«Будаўніцтва карабля мы пачалі ў красавіку. Яно працягвалася літаральна да сярэдзіны верасня, — прызнаецца Аляксей Карандзей. — У Беларусі такі карабель першы і пакуль што адзіны».

У фестывалі таксама прыняло ўдзел судна Фрэя з горада Херсона. З Бярозаўкі ладдзі па Нёмане выправіліся далей — у Масты, а потым у Гародню. Гэта была сапраўдная лодачная экспедыцыя з прыпынкамі варажскага флоту ў прыбярэжных населеных пунктах, так званых «вялікіх стаянках» фестывалю. На кожным з прыпынкаў разбівалі сярэднявечныя лагеры. Шматлікія ўдзельнікі рыцарскіх клубаў з розных краін паказалі сваё воінскае майстэрства. На тэрыторыі варажскага лагера для гледачоў увесь дзень працавала сапраўднае сярэднявечнае стрэльбішча, дзе былі прадстаўлены некалькі відаў лукаў, кідальных сякер і коп'яў.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел беларускія і ўкраінскія фолк-групы.

Такім чынам, «вялікія стаянкі» пазнаёмілі сваіх наведвальнікаў з культурай усходніх славян, плямёнаў балтаў і скандынаўскіх вікінгаў.

Фестываль «З варагаў у грэкі» запланаваны як штогадовае міжнароднае мерапрыемства, якое будзе праходзіць кожны раз на розных суднаходных шляхах таго часу, тым самым адраджаючы легендарны шлях «з варагаў у грэкі».

У арганізатараў і непасрэдных удзельнікаў фестывалю шмат цікавых задум і планаў. Напрыклад, хлопцы мараць прайсці на варажскіх караблях па Дняпры да Кіева, а па Нёмане трапіць у Балтыйскае мора.

У вольны ад «вялікага плавання» час ладдзя будзе знаходзіцца ў музеі жывой гісторыі «Панёманскае гарадзішча» ў горадзе Бярозаўка Лідскага раёна. Дарэчы, музей хлопцы таксама будуюць уласнымі рукамі.

Вольга АЛЯКСЕЕВА

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

МАГІЯ АБРУСА

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 23 верасня.)

Абавязковым элементам настольнага ўбранства абрус канчаткова зрабіўся ў XVIII стагоддзі. Багатая шляхта і мяшчане ўжывалі палатняныя абрусы, бяднейшыя людзі — паркалёвыя. У сялян функцыю абруса выконваў вялікі гафтаваны ручнік. Найбольш цаніліся абрусы са шчыльнага белага галандскага палатна, тканага ў розныя ўзоры: луску карпа, зоркі, кветкі і іншае.

Калі гасцей і сталоў было шмат, а абрусаў бракавала, тады цэнтральныя, найбольш пачэсныя, сталы засцілалі лепшымі абрусамі, а бліжэй да краёў клалі горшыя, канчаючы простым грубым шэрым палатном. Існаваў нават выраз — «сядзець на шэрым канцы». Калі дастатак гаспадара дазваляў, абрусы мянялі пры кожнай перамене страў — гэта значыць, да 4 разоў на адной бяседзе.

Пры тым вялікім сімвалічным значэнні, якое меў абрус для нашых продкаў, не даводзіцца здзіўляцца, што яго ўжывалі ў розных магічных абрадах, папросту — у чарадзействе. Самая вядомая варажба з выкарыстаннем абруса адбывалася напярэдадні Божага Нараджэння, на Куццю, калі пад белым абрусам на стол расцярушвалі сена або салому (напамін пра нараджэнне Збавіцеля паміж валом і аслом, на сене) і члены сям'і па адным цягнулі саломінкі з-пад абруса, па іх даўжыні гадаючы пра тое, якім каму выпадзе наступны год. Дарэчы, гэты вігілійны абрус, апроч іншага, яшчэ і метафара таго палатна — плашчаніцы, у якую было загорнута цела Хрыстоса, пакладзена ў труну, а значыць — і яго Уваскрэсення...

Пры дапамозе абруса на Узвіжанне (27 верасня) было магчыма атрымаць прыкладна такія ж звышнатуральныя здольнасці, як і з дапамогай папараць-кветкі, знойдзенай на Купалле. Трэба было толькі сустрэць Змяінага цара. Увогуле ж, сустрэч са змеямі звычайна пазбягалі. Але ў такі дзень, лічылася, гэта зрабіць не проста: верылі, што менавіта тады ўсе лясныя гады (змеі, жабкі ды яшчаркі) збіраюцца ў зграі, каб дакрануцца да нейкай чароўнай кветкі і разам адпаўзці на зіму ў свае патаемныя сховішчы. І быццам бы напярэдзе ўсіх паўзе ў сваё царства Змяіны цар, а за ім ужо яго міністры, стражнікі і ўсялякая іншая драбяза. А на галаве ў цара — вядома ж, карона! З залатых рожак. Вось тут таму кемліваму зуху, які асмельваўся ў гэты дзень ісці ў лес, і трэба знарок трапіцца на яго шляху — разаслаць абрус, раскласці на ім хлеб ды соль, і тады цар у знак удзячнасці скіне адзін залаты ражок. Шчаслівы ўладальнік атрымае надзвычайную мудрасць і абачлівасць, будзе здольным чытаць чужыя думкі і пазбягаць усіх расстаўленых ворагамі і самім жыццём пастак. І, вядома, ніводная змяя ніколі не асмеліцца ўкусіць спрытнага ўладальніка царскага «пропуска» ў іншасвет...

Старадаўняе беларускае пажаданне добрага шляху — «Абрусам дарога!» — нагадвае пра тую самую ідэю: вельмі паважанай асобе, у ідэале, увесь шлях варта было б заслаць бясконца доўгім абрусам, у знак павагі. Але тады можна сказаць, што абрус — метафара самога жыцця. І яшчэ адным доказам гэтага сімвалізму з'яўляецца лацінскае слова mapa, mappa, геаграфічная карта, мадэль зямнога свету, — паходзіць ад яўрэйскага — «абрус»...

Вось яшчэ адна магічная функцыя абруса ў беларускай народнай магіі — **павелічэнне ўдойнасці кароў. Каб кароўкі лепш даіліся і не траціласа малако, жывёлу трэба было абліць вадой з трох калодзежаў або, пакрыўшы ваду з калодзежа абрусам, выпіць праз яго чатыры разы, пачаргова перастаўляючы вядро на чатыры бакі свету ад калодзежа.**

Абрус (нямыты!), пакінуты з велікоднага стала, быў павінны засцерагаць ад маланкі і пажару ў час навальніцы. (Гэтай жа мэце, дарэчы, служылі **грамнічныя свечкі, соль, асвячоная ў Чысты чацвер ці ў каталіцкі прысвятак святой Агаты (5 лютага), костка ад велікоднага мяса і шалупінне велікодных яек.)**

Сёння абрус, як бадай амаль кожны прадмет нашага побыту, страціў магічныя функцыі і выйшаў з фокусу грамадскай увагі. У паслявоеннай Еўропе амаль два пакаленні, недзе да сярэдзіны 1970-х гадоў, пражылі фактычна без абрусаў на абедзенных сталах. У абноўленых інтэр'ерах на чыстых строгіх паверхнях светлага дрэва не прадугледжвалася ніякіх абрусаў і сурвэтак. Керамічная ваза з калючай галінкай на паліраванай паверхні стала — найвышэйшы шык пачатку 1960-х гадоў. Ці не тоіцца тут і сувязь з сексуальнай рэвалюцыяй? Памятаеце, што мы казалі пра «голы» стол, якога чалавек Сярэднявечча і Новага часу яшчэ саромеўся? Але, на шчасце, не ўсе паддаліся радыкальным трэндам. І ўсё ж для большасці і сёння стол, засланы абрусам, падаецца больш натуральным, чым «голы», хаця магія гэтага старажытнага прадмета для нас ужо няўцямная....